Падтрымай "Вясну" на PATREON

Жыхара Маладзечна аштрафавалі за назву персальнай старонкі ў Instagram

29.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, экстрэмізм



Яўген Радзівілка. Фота з telegram

На жыхара Маладзечна склалі пратакол па арт. 17.11 КаАП за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Яўгена Радзівілку вінавацяць у тым, што назва яго персанальнай старонкі ў Instagram утрымлівае абрэвіятуру з чатырох літар, якая паўтары гады таму была ўнесена ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

У пратаколе, складзеным трэцяга траўня Маладзечанскім РАУС, напісана, што Яўген Радзівілка *“у перыяд часу з 3 верасня 2019 года па цяперашні час стварыў персанальную старонку з назвай https://www.instagram.com/kr_a***_a_arab/, а таксама размясціў сацыяльны статус з назвай “кр_а***_а_араб”, дзе маецца кампацізыя ў выглядзе абрэвіятуры А***”.*


Па словах праваабаронцы “Вясны” з Маладзечна **Аляксандра Капуцкага**, Яўгена стала адсочваць міліцыя, калі той у сваіх публікацыях пачаў адзначаць блогера Nexta.

Суд над Яўгенам Радзівілкам пачаўся 28 траўня ў Маладзечанскім раённым судзе. Справу разглядае суддзя **Іна Каханоўская.** Працяг суда прызначаны на 14.30 29 траўня. Верагодна тады і будзе прынята рашэнне па справе.


Дапоўнена: Суддзя Каханоўская прыняла рашэнне аштрафаваць Яўгена Радзівілку на **12 базавых велічынь (324 рублі).**

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY